**Платныя адукацыйныя паслугі зараз аказваюць амаль усе сярэднія навучальныя ўстановы краіны. Праўда, адны падыходзяць да гэтай справы фармальна і безыніцыятыўна, бо яна навязана зверху і за яе неабходна ўвесь час трымаць справаздачу і выконваць планавыя паказчыкі... Другія, такія як гімназія № 42 Мінска, разглядаюць пазабюджэтную дзейнасць як дадатковую крыніцу развіцця сваёй матэрыяльна-тэхнічнай базы, магчымасць павышэння якасці ведаў вучняў, а таксама дадатковага заробку для педагогаў.**



# Дадатковая крыніца школьнага бюджэту

Пазабюджэтная дзейнасць у гімназіі пачыналася з гуртка па інфарматыцы для вучняў пятага класа, які дзейнічаў на аснове самаакупнасці. Сёння спіс дадатковых платных паслуг, якія аказвае гімназія, вялікі. Гэта і розназўроўневая падрыхтоўка да цэнтралізаванага тэсціравання па самых папулярных прадметах, індывідуальная карэкцыя ведаў, падрыхтоўка дзяцей да конкурсных гімназічных іспытаў, аказанне псіхалагічнай дапамогі і павышэнне псіхалагічнай кампетэнцыі дзяцей і г.д.

Як заўважыла дырэктар гімназіі № 42 Мінска Ірына Міхайлаўна Сайко, попыт на адукацыйныя паслугі ўвесь час павялічваецца. Вучні пасля школьных і факультатыўных заняткаў дадаткова наведваюць розныя платныя гурткі і курсы, звяртаюцца за дапамогай да рэпетытараў. У гімназіі вырашылі вярнуць дзяцей у родную ўстанову і пры гэтым яшчэ папоўніць яе

“Пазабюджэтная дзейнасць як механізм, які садзейнічае пашырэнню спектра адукацыйных паслуг у агульнаадукацыйнай установе” на грант Мінгарвыканкама. Ірыну Глебаўну можна смела назваць сапраўдным маркетолагам па пытаннях арганізацыі платных дадатковых адукацыйных паслуг у школе.

На першым этапе рэалізацыі свайго праекта І.Г.Арэф'ева дасканала вывучала нарматыўную прававую базу, даследавала запыты гімназістаў і іх бацькоў, праводзіла семінар для педагогаў гімназіі, высвятляла гатоўнасць настаўнікаў да работы ў гуртках на аснове самаакупнасці, рыхтавала неабходную дакументацыю, дагаворы з бацькамі і выконвала шмат іншай работы.

Ірына Глебаўна сцвярджае, што на сёння ўся неабходная заканадаўчая база для арганізацыі пазабюджэтнай дзейнасці ў школе распрацавана, трэба толькі яе



канцтавары, флэшкі, дыскі”, — пахвалілася дырэктар.

Сёння трэць педагогаў гімназіі задзейнічана ў рабоце гурткоў на аснове самаакупнасці. Пасля двух гадоў такой работы яны адзначаюць, што гэта стымулюе іх на самаразвіццё, сістэматызацыю асабістых напрацовак, адпрацоўку новых форм арганізацыі індывідуальнай работы з вучнямі. І на аплату працы яны зараз глядзяць крыху інакш.

Ірына Міхайлаўна Сайко лічыць сваіх педагогаў высакакласнымі спецыялістамі, якія даказалі сваю прафесійнасць: іх выхаванцы перамагаюць у алімпіядах і розных конкурсах, годна вытрымліваюць выпрабаванні цэнтралізаванага тэсціравання і становяцца студэнтамі ВНУ. Дарэчы, у апошнія гады ў гімназіі адзначаецца стопрацэнтнае паступленне ў ВНУ.

Кваліфікаваны школьны настаўнік сёння лепш за любога выкладчыка ВНУ падрыхтуе дзяцей да тэсціравання, перакананы ў гімназіі. Ён ведае псіхалогію і асаблівасці дзяцей школьнага ўзросту, школьную праграму, мае вопыт падрыхтоўкі да ЦТ. Паводле назіранняў Ірыны Міхайлаўны, на бюджэтную форму навучання ў ВНУ часцей паступаюць менаві-

камаштабную рэкламную акцыю па прапагандзе сваіх паслуг. У жніўні на сайце школы можна было знайсці аб'яву, такая ж аб'ява змяшчалася і на школьным стэндзе, гаворка пра дадатковыя платныя адукацыйныя паслугі вялася на класных гадзінах і бацькоўскіх сходах.

Група дзяцей з гуртка па падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання па рускай мове напалову складаецца з вучняў іншых школ. Яны прыйшлі сюды па рэкамендацыях сваіх знаёмых і настаўнікаў, а яшчэ таму, што заняткі праводзіць Ганна Іларыёнаўна Урублеўская. Ганна Іларыёнаўна — “малады пенсіянер”, як заўважылі ў гімназіі, але яна яшчэ поўная сіл і жадання працаваць, яе вопыт і веды бясцэнныя.

На сённяшні момант гімназія гатова ажыццяўляць пазабюджэтную дзейнасць на ўсіх ступенях навучання. З кастрычніка па просьбе бацькоў тут пачалі працаваць групы па падрыхтоўцы да паступлення ў гімназію. Справа ў тым, што гімназія № 42 не мае сваёй пачатковай школы і для таго, каб будучым школьнікам было крыху камфортней на гімназічных іспытах, у маі па выхадных навучальная ўстанова праводзіла для жадаючых дні адкрытых дзвярэй, калі дзеці маглі пазнаёміцца з настаўнікамі, якія будуць чытаць ім тэксты дыктовак, і са школай наогул. Група па падрыхтоўцы да паступлення пастаянна папаўняецца. Пачыналі работу з васьмю дзецьмі, а зараз іх трынаццаць. З пачаткоўцамі займаецца былая настаўніца пачатковых класаў гімназіі Марыя Мі-



бюджэт. Дзецям і іх бацькам прапанавалі вялікі выбар адукацыйных паслуг высокай якасці на базе гімназіі.

Да гэтага вучэбнага года навучэнцы гімназіі № 42, якая мела юрыдычны профіль, вывучалі на паглыбленым узроўні ЧГД, замежную мову, матэматыку. Зараз гімназія часткова прапануе ў якасці платных адукацыйных паслуг тое, што раней з'яўлялася школьным кампанентам. Як вядома, нормы вучэбнай нагрузкі на платныя паслугі не распаўсюджваюцца, таму вучні атрымалі магчымасць задаволіць усе свае адукацыйныя запыты за іх кошт. У выніку рады бацькі, паколькі стала больш камфортна і не так дорага, а кіраўніцтва гімназіі атрымала дадатковую крыніцу для папаўнення бюджэту, дзецям таксама падабаецца падобная форма навучання.

"Зразумела, што арганізацыя пазабюджэтнай дзейнасці ў школе — сур'ёзная і адказная работа, якая патрабуе адпаведнай падрыхтоўкі. Выдатна, калі ў дырэктара будзе памочнік, які ведае гэтую справу і жадае ёю займацца", — заўважыла І.М.Сайко.

Дырэктару гімназіі № 42 дапамагае Ірына Глебаўна Арэф'ева (цяпер ужо былы намеснік дырэктара, але кіраўнік гуртка на аснове самаакупнасці). Як адзначае І.М.Сайко, у Ірыны Глебаўны было жаданне займацца гэтай справай, да таго ж яна атрымала адпаведныя веды на курсах МДІРА "Фінансавая самастойнасць установы адукацыі", абараніла праект ўважліва вывучыць, можна таксама атрымаць кансультацыі ў спецыялістаў Міністэрства адукацыі.

Для таго каб захапіць больш педагогаў работай у гуртках на аснове самаакупнасці, у гімназіі яшчэ ў верасні 2007 года быў праведзены семінар па тэме "Спецыфіка рынку адукацыйных паслуг", на якім гаворка ішла пра адукацыйную паслугу як асобны від тавару і даследавалася гатоўнасць педагогаў працаваць у гуртках на аснове самаакупнасці. Сапраўды, ахвотнікаў напачатку было няшмат. Галоўнае, што не задавальняла педагогаў, — аплата працы. Канечне, у параўнанні з рэпетытарскай дзейнасцю гэтая работа здаецца не такой высокааплатнай, аднак і яна дае прыробак да асноўнай заработнай платы. Так, за восем дадатковых заняткаў у групе на аснове самаакупнасці настаўнік атрымлівае ў месяц крыху больш за 50 тысяч. Восем гадзін — гэта адзін рабочы дзень настаўніка. Пагадзіцеся, не кожны педагог сёння за свой рабочы дзень атрымлівае такую суму. Да таго ж установа забяспечвае сваіх работнікаў матэрыяламі, тэхнікай. Настаўнікі-прадметнікі могуць са сродкаў ад пазабюджэтнай дзейнасці набыць у свае кабінеты неабходную літаратуру і нават тэхніку.

"Толькі за апошні час за пазабюджэтныя сродкі мы набылі некаторую літаратуру па англійскай мове, два камп'ютэры для псіхолага і намесніка дырэктара. За гэтыя сродкі цалкам абслугоўваем школьную аргтэхніку, набываем паперу,

Кваліфікаваны школьны настаўнік сёння лепш за любога выкладчыка ВНУ падрыхтуе дзяцей да тэсціравання, перакананы ў гімназіі. Ён ведае псіхалогію і асаблівасці дзяцей школьнага ўзросту, школьную праграму, мае вопыт падрыхтоўкі да ЦТ. Паводле назіранняў Ірыны Міхайлаўны, на бюджэтную форму навучання ў ВНУ часцей паступаюць менавіта тыя дзеці, якія добрасумленна вучыліся ў школе, наведвалі факультатывы і не карысталіся дапамогай рэпетытараў. Усе неабходныя веды яны засвойвалі на ўроках, факультатыўных занятках і на занятках у гуртках.

Ірына Глебаўна Арэф'ева расказала, што пытаннямі цэнтралізаванага тэсціравання яна зацікавілася задоўга да таго, як яно з'явілася ў Беларусі. Паступова збіраўся матэрыял і назапашваўся вопыт. Сёння настаўніца ўсё сістэматызавала і распрацавала сваю праграму па падрыхтоўцы да ЦТ. Пра эфектыўнасць праграмы сведчыць той факт, што вучні Ірыны Глебаўны набіралі на цэнтралізаваным тэсціраванні па матэматыцы да 96 балаў. "Нядаўна выйшла мая кніжка "Матэматыка. Дапаможнік-рэпетытар", дзе я прадстаўляю сваю сістэму работы", — не без гордасці паведаміла Ірына Глебаўна. З такімі ведамі і вынікамі І.Г.Арэф'ева магла б быць запатрабаваным рэпетытарам, але, па яе шчырым прызнанні, гэтая дзейнасць яе зусім не прываблівае, яна атрымлівае задавальненне ад работы ў школе з калектывам дзяцей.

"Гурткі на аснове самаакупнасці па падрыхтоўцы да ЦТ складаюцца прыкладна з сямі-васьмі чалавек, — адзначае Ірына Глебаўна. — Фактычна гэта індывідуальная работа з дзецьмі. У нас ёсць варыянт курсаў, разлічаны на адзін-два вучэбныя гады. Сёння мы прапаноўваем падрыхтоўку да ЦТ па англійскай і рускай мове, матэматыцы. Групы імкнёмся фарміраваць такім чынам, каб дзецям было зручна. Так, спачатку яны ідуць на матэматыку, потым займаюцца рускай мовай, на наступны дзень у іх руская мова, а пасля, напрыклад, англійская".

Варта адзначыць, што платнымі адукацыйнымі паслугамі гімназіі № 42 карыстаюцца не толькі яе выхаванцы, але і вучні іншых навучальных устаноў. Сёння яны складаюць 40 працэнтаў ад агульнай колькасці дзяцей, якія займаюцца ў гуртках на аснове самаакупнасці. Нельга сказаць, што гімназія разгарнула шыро-

ва праводзіла для жадаючых дні адкрытых дзвярэй, калі дзеці маглі пазнаёміцца з настаўнікамі, якія будуць чытаць ім тэксты дыктовак, і са школай наогул. Група па падрыхтоўцы да паступлення пастаянна папаўняецца. Пачыналі работу з васьмю дзецьмі, а зараз іх трынаццаць. З пачаткоўцамі займаецца былая настаўніца пачатковых класаў гімназіі Марыя Міхайлаўна Клімянкова. Кіраўніцтва гімназіі ведае яе як добрага спецыяліста і вельмі задаволена яе выхаванцамі, якія зараз вучацца ў гімназіі.

"Мы не толькі дапамагаем дзецям атрымліваць жаданыя веды, — гаворыць Ірына Глебаўна. — Таксама вырашаем праблему занятасці дзяцей у другой палове дня. Любыя бацькі адчуваюць сябе больш спакойна, калі іх дзіця занята добрай справай, знаходзіцца пад наглядам педагогаў, атрымлівае гарачае харчаванне. У гімназіі ёсць свая сталовая, дзе можна смачна паесці. Разумныя бацькі разумеюць, што ўкладзеныя ў дзіця грошы вернуцца сто разоў".

"Лепшы паказчык выніковасці работы гурткоў на аснове самаакупнасці — плата за навучанне, а таксама павелічэнне колькасці дзяцей у групах, іх стабільнае наведванне", — адзначае Ірына Міхайлаўна Сайко. А Ірына Глебаўна дадае, што сёння эфектыўныя платныя адукацыйныя паслугі ва ўмовах канкурэнцыі з боку ВНУ і рэпетытараў можа аказваць тая навучальная ўстанова, якая мае высокую ступень "адукацыйнай прывабнасці" ў асноўнай дзейнасці.

Аналізуючы работу па аказанні платных адукацыйных паслуг, у гімназіі № 42 прыйшлі да высновы, што дзякуючы педагагічнаму патэнцыялу ўстановы, зручнаму месцазнаходжанню (гімназія размешчана ў цэнтры сталіцы) магчымы выхад на новы арганізацыйны ўзровень аказання запатрабаваных паслуг для ўсіх жадаючых праз стварэнне адкрытага адукацыйнага цэнтра як структурнай адзінкі гімназіі. Па меркаванні І.Г.Арэф'евай, рэалізацыя падобнай ідэі дазволіць за разумную цану даць годную дадатковую адукацыю і такім чынам задаволіць запыты дзяцей і бацькоў.

**Святлана КІРСАНАВА.**

НА ЗДЫМКАХ: дырэктар гімназіі І.М.Сайко і кіраўнік гуртка І.Г.Арэф'ева; заняткі ў групе праводзіць Г.І.Урублеўская.

**Фота аўтара.**